**Вольга Коршун**

**Галоўны бібліятэкар юнацкага філіяла Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага**

# РАЗАМ ДУМАЦЬ ПРА БУДУЧЫНЮ

«Што пасееш у юнацтве – тое пажнеш на старасці гадоў» – сцвярджае мудрае народнае выслоўе. Юнацтва, як крыніца, з якой пачынаецца рака, дорыць сілы чалавеку на ўсё жыццё. Зярняты духоўнасці, пасеяныя ў юнацкіх душах, дадуць потым добры плён.

Данесці да юнага чытача вечныя каштоўнасці, стварыць у бібліятэцы атмасферу духоўнасці, творчасці, накіраванасці ў будучыню, дапамагчы разабрацца ў складаным і шматгранным свеце – вось да чаго імкнуцца супрацоўнікі інфармацыйна-адукацыйнага цэнтра ДУК «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага».

Будынак, у якім размяшчаецца інфармацыйна-адукацыйны цэнтр – гісторыка-культурны помнік архітэктуры другой паловы XVIII ст., вядомы як домік Элізы Ажэшкі. У кароткі тэрмін (менш чым за год) у доміку былі зроблены капітальны рамонт і мадэрнізацыя памяшканняў. Створаны камфортныя ўмовы для павышэння адукацыйнага ўзроўню, развіцця інтэлекту і творчых здольнасцей моладзі. На першым паверсе размяшчаецца юнацкі філіял, на другім – аддзел выданняў на замежных мовах.

Багаты ўніверсальны фонд налічвае звыш 98 тыс. экз. дакументаў. Гэта кнігі, часопісы, відэа- і аўдыякасеты, кампакт-дыскі, выданні для інвалідаў па зроку і іншыя дакументы на беларускай, рускай і 47 мовах свету. Захоўваецца калекцыя старадаўняй мастацкай і гістарычнай літаратуры XIX–XX стст., у тым ліку прыжыццёвыя выданні Э. Ажэшкі, Ю. Пруса, Г. Сянкевіча, Ч. Дзікенса і інш.

Арганізацыя цэнтра дазволіла пашырыць спектр бібліятэчных паслуг з выкарыстаннем сучасных камп'ютарных тэхналогій. Створана 10 аўтаматызаваных рабочых месцаў для карыстальнікаў, у тым ліку для інвалідаў па зроку, што забяспечвае доступ да сеткі Інтэрнэт, электронных каталогаў буйнейшых бібліятэк краіны, а таксама баз дадзеных, створаных супрацоўнікамі абласной бібліятэкі. Абслугоўванне чытачоў вядзецца ў аўтаматызаваным рэжыме.

У цэнтры працуюць курсы па вывучэнні шасці замежных моў (англійскай, нямецкай, французскай, польскай, італьянскай і іспанскай), праводзяцца індывідуальныя і групавыя заняткі па авалоданні камп'ютарнай тэхнікай і графікай.

У 2001 г. у доміку Элізы Ажэшкі быў створаны мемарыяльны пакой, прысвечаны жыццю і творчасці пісьменніцы. Экскурсіі для жыхароў і гасцей г. Гродна праводзяцца супрацоўнікамі бібліятэкі на беларускай, рускай, польскай і англійскай мовах. З моманту адкрыцця пакой наведалі звыш 40 тыс. чалавек.

З 2002 г. у цэнтры дзейнічае літаратурна-музычны салон «У пані Элізы», дзе прайшло больш за 20 пасяджэнняў, асноўнымі ўдзельнікамі якіх з'яўляюцца творчая інтэлігенцыя горада, студэнты. Тэматыка вечароў тычыцца не толькі жыцця і творчасці пісьменніцы, але і знакамітых дзеячаў культуры, літаратуры і мастацтва. Літаратурна-музычныя пасяджэнні праводзяцца на беларускай, польскай і рускай мовах.

З 2005 г. супрацоўнікамі цэнтра была адноўлена традыцыя Э. Ажэшкі праводзіць свята «Навагодняя ёлка» для дзяцей-сірот. Напярэдадні святкавання аб'яўляецца дабрачынная акцыя па зборы падарункаў «Падары Новы год дзецям-сіротам», у якой актыўна ўдзельнічаюць прадстаўнікі праваслаўнай і каталіцкай канфесій, калектывы прадпрыемстваў і арганізацый г. Гродна, а таксама чытачы абласной бібліятэкі.



Кожны год на навагоднюю ёлку ў домік пісьменніцы запрашаюцца выхаванцы Панямунскага дзіцячага дома, Лойкаўскага дзіцячага сацыяльнага прытулку і Дома змешанага тыпу г. Гродна. Напярэдадні 2012 г. для дзяцей была падрыхтавана святочная праграма з конкурсамі, гульнямі, песнямі і танцамі. Хлопчыкі і дзяўчынкі сустрэліся з Дзедам Марозам, Снягуркай, Лісой Алісай, Катом Базіліа і Геніяльным Сышчыкам, у ролі якіх выступілі супрацоўнікі бібліятэкі. Дзецям былі ўручаны навагоднія падарункі і салодкія пачастункі.

З 2004 г. у бібліятэцы таксама ладзяцца дабрачынныя акцыі для дзяцей-сірот з Лойкаўскага сацыяльнага прытулку, прымеркаваныя да Міжнароднага дня аховы дзяцей: «Ад сэрца да сэрца», «Не забыць ніводнае